Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ
## (скрыпка, альт, віяланчэль)

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамках спецыяльнасці 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка), 1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнік**

*Т. У. Дзейко,* старшы выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* народных інструментаў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка";

*Г. У. Някрасава,* загадчык кафедры камернага ансамбля ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай мастацтва эстрады ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 3 ад 29.09.2010 г. );

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 1 ад 05.10.2010 г.);

секцыяй па спецыяльнасці 1-17 03 01 "Мастацтва эстрады" навукова-метадычнага савета па харэаграфіі і мастацтве эстрады Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 12.10.2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *Т. У. Дзейко*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 03 01 “Мастацтва эстрады (па напрамках)” (напрамкі спецыяльнасці 1-17 03 01-01 “Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)”, 1-17 03 01-02 “Мастацтва эстрады (камп’ютарная музыка)”).

Дысцыпліна “Інструментальны ансамбль (скрыпка, альт, віяланчэль)” з’яўляецца важнейшай і неабходнай для студэнтаў, якія авалодваюць майстэрствам ігры на струнна-смычковых інструментах. Ансамблевае выканальніцтва мае вялікае значэнне ў падрыхтоўцы да самастойнай прафесійнай дзейнасці будучых выкладчыкаў і ўдзельнікаў ансамбляў, аркестраў. Знаёмства з шырокім дыяпазонам акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі, вывучэнне стылістычна і мастацка разнастайнай музычнай літаратуры садзейнічае ўсебаковаму развіццю музыкантаў.

Дысцыпліна “Інструментальны ансамбль” цесна ўзаемазвязана з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як “Спецінструмент”, “Імправізацыя на спецінструменце”, “Аркестравы клас”, “Інструментазнаўства, аранжыроўка і пераклад музычных твораў”.

*Мэтай курса* “Інструментальны ансамбль” з’яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрствам ансамблевай ігры.

Мэта курса абумоўлівае наступныя *задачы:*

– развіць комплекс музыкальных здольнасцей, неабходных для ансамблевага выканальніцтва (дакладнае інтанаванне, адчуванне ансамблевага рытму, уменне слухаць галасы калег па ансамблі і г. д.);

– выпрацаваць свабоднае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў;

– навучыць разуменню мастацкай задумы аўтара музычнага твора і прыёмам яе ўвасаблення пры ансамблевым выкананні;

– сфарміраваць мастацкі густ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі *ведамі і ўменнямі,* якія дазволяць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– прынцыпы ансамблевага выканання музычнага твора;

– прынцыпы рэалізацыі мастацкай задумы аўтара;

– формы і жанры розных стыляў і кірункаў акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі для інструментальнага ансамбля;

– спецыфіку ігры на акустычных і электраінструментах у ансамблі;

– спосабы выкарыстання тэхнічных сродкаў выразнасці ў ансамблі;

– прынцыпы самастойнай работы над музычным ансамблевым творам;

– выканальніцкія сродкі выразнасці ў ансамблі.

Выпускнік павінен *умець*:

– увасабляць прынцыпы ансамблевага выканання музычнага твора на практыцы;

– рэалізоўваць сумесна з партнёрамі мастацкую задуму аўтара;

– выконваць у ансамблі творы розных форм і жанраў поліфанічнай і гамафонна-гарманічнай музыкі розных стыляў і кірункаў;

– скарыстоўваць спецыфіку ігры на акустычных і электраінструментах у ансамблі;

– выкарыстоўваць выканальніцкія тэхнічныя сродкі выразнасці розных інструментаў;

– самастойна (сумесна з партнёрамі) працаваць над музычным творам;

– прафесійна карыстацца выканальніцкімі сродкамі выразнасці ў ансамблі падчас стварэння інтэрпрэтацыі музычнага твора;

– прымяняць веды ў працэсе выкладчыцкай дзейнасці.

*Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання,* якія адказваюць мэтам вывучэння дадзенай дысцыпліны, з'яўляюцца: метад праектаў, метад творчых майстэрняў, брыгадны метад, метад аналізу пэўных сітуацый, праблемны метад.

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб самастойнай рабоце студэнтаў і ажыццяў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляецца ў выглядзе аўдыторных і пазааўдыторных формаў. Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем.

Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне “Інструментальны ансамбль” у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам для напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-01 “Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)” складае 468 гадзін, з якіх 240 адведзены на аўдыторныя (практычныя) заняткі; для напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-02 “Мастацтва эстрады (камп’ютарная музыка)” – 200 гадзін, з якіх 108 адведзены на аўдыторныя (практычныя) заняткі. Веды і практычныя навыкі студэнтаў рэкамендуецца кантраляваць у працэсе навучання ў форме залікаў і экзаменаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных (практычных) гадзін | |
|---|---|---|
| | *напрамак спецыяльнасці 1-17 03 01-01 "Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)"* | *напрамак спецыяльнасці 1-17 03 01-02 "Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)"* |
| *Тэма 1.* Уводзіны | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Асаблівасці настройкі музычных інструментаў у ансамблі і аркестры | 8 | 4 |
| *Тэма 3.* Падбор праграмы | 6 | 6 |
| *Тэма 4.* Інтанаванне | 22 | 10 |
| *Тэма 5.* Штрыхі | 24 | 14 |
| *Тэма 6* . Аплікатура | 20 | 10 |
| *Тэма 7.* Вібрацыя | 20 | 12 |
| *Тэма 8* . Рытм | 32 | 14 |
| *Тэма 9.* Тэмп і дынаміка | 26 | 12 |
| *Тэма 10.* Вывучэнне музычных форм у розных эстрадных стылях | 50 | 14 |
| *Тэма 11.* Выканальніцкае майстэрства ў асноўных джазавых стылях | 20 | - |
| *Тэма 12.* Канцэртнае выступленне | 10 | 10 |
| **Усяго…** | **240** | **108** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*Тэма 1. Уводзіны*

Задачы і мэты дысцыпліны ў музычным развіцці і спецыяльнай падрыхтоўцы студэнтаў выканання ў інструментальным ансамблі. Стварэнне адзінага творчага калектыву – галоўная ўмова арганізацыі навучальнага і творчага працэсаў у класе інструментальнага ансамбля. Падбор удзельнікаў ансамбля. Улік індывідуальных якасцей, музыкальных здольнасцей, тэхнічнай і псіхалагічнай сумяшчальнасці ўдзельнікаў ансамбля.

*Тэма 2. Асаблівасці настройкі музычных інструментаў у ансамблі і аркестры*

Адрозненні настройкі музычных інструментаў у ансамблі і аркестры ад сольнай настройкі. Спецыфіка інтанавання і гучання інтэрвалаў і акордаў у працэсе ансамблевага выканальніцтва.

*Тэма 3. Падбор праграмы*

Улік індывідуальных асаблівасцей кожнага ўдзельніка музычнага калектыву пры падборы праграмы для інструментальнага ансамбля. Выкарыстанне музычных твораў для інструментальнага ансамбля розных стылявых напрамкаў акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі.

*Тэма 4. Інтанаванне*

Інтанацыйныя цяжкасці пры ансамблевым выкананні. Паступовае фарміраванне інтанацыйнага адзінства ў ансамблі ў працэсе сумеснай работы. Вывучэнне фрагментаў музычных твораў рознымі складамі інструментаў. Кантроль строю ў час выканання.

*Тэма 5. Штрыхі*

Развіццё навыкаў ансамблевай ігры: прынцыпы сумеснага выканання штрыхоў, артыкуляцыі ў ансамблевай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прынцыпы рэдагавання штрыхоў. Дасягненне выразнага гучання розных фактурных кантрапунктаў. Стылістычныя асаблівасці выканання штрыхоў у творах розных кампазітараў.

*Тэма 6. Аплікатура*

Выкарыстанне адзіных аплікатурных прынцыпаў у працэсе ансамблевага выканання. Свабоднае арыентаванне ва ўсіх танальнасцях у храматычнай паслядоўнасці. Узаемадзеянне аплікатуры і дакладнага інтанавання. Аплікатурнае бачанне меладычнага матэрыялу, мысленне аплікатурнымі стандартамі. Трэнінг на аўтаматызм выканання аплікатурных структур. Дасягненне адзінства тэмбру розных музычных інструментаў у ансамблі.

*Тэма 7. Вібрацыя*

Адзінства вібрацыі ва ўсіх удзельнікаў інструментальнага ансамбля. Разнастайнасць вібрацыі ў залежнасці ад стылістычных асаблівасцей і характару выконваемай музыкі.

*Тэма 8. Рытм*

Адзінства рытмічнай артыкуляцыі ў ансамблевым выкананні. Цэзура, рубата і агагічныя адхіленні як галоўныя сродкі мастацкай выразнасці. Рытмічная артыкуляцыя ў залежнасці ад стылістычных асаблівасцей і характару выконваемай музыкі. Спалучэнне рытмічнай дакладнасці з выразным мастацкім выкананнем.

*Тэма 9. Тэмп і дынаміка*

Фарміраванне адзінага пачуцця тэмпу ўдзельнікаў інструментальнага ансамбля. Прыёмы кіравання, якія выкарыстоўваюцца пры ансамблевым выкананні. Паказ уступу, зняцця гучнасці, змены тэмпу, паўз, атакі апорных гукаў; філіраванні гукаў, змены дынамікі. Адзінства тэмпу ў музычным творы.

Валоданне дынамікай ад “pp” да “ff”. Крэшчэнда, дымінуэнда. Сфарцанда, “fp”. Залежнасць дынамікі ад стылю му-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зычнага твора. Рэльефная, тэрасная і графічная дынаміка. Выкарыстанне інтанацыйных эфектаў з мэтай агучвання дынамічных ліній і гарманічнай выразнасці.

*Тэта 10. Вывучэнне музычных форм у розных эстрадных стылях*

Аналітычная праца над музычным творам. Усведамленне ідэйна-мастацкага зместу, формы, стылю сачынення; вызначэнне функцый галасоў (кантрапунктаў); выяўленне кульмінацыі ў частках, раздзелах і асобных фразах. Адзінства інтэрпрэтацыі і адчування музычнага вобраза ў інструментальным ансамблі. Бездакорнае вывучэнне індывідуальнай партыі кожным удзельнікам ансамбля як абавязковая ўмова паспяховай работы інструментальнага ансамбля.

*Тэма 11. Выканальніцкае майстэрства ў асноўных джазавых стылях*

Блюз. Азнаямленне з разнавіднасцямі блюза. Вывучэнне гарманічнай асновы класічнага дванаццацітактавага блюза. Блюзавы лад, блюзавыя тоны. Асаблівасці штрыхоў, артыкуляцыі, манеры выканання. Свінг. Трыёльная пульсацыя. Вывучэнне характэрных для свінга акцэнтаў, артыкуляцыі і штрыхоў, фразіроўкі. Выкананне твораў у стылі свінг. Джаз-рок. Вывучэнне рытмічных канфігурацый у стылі джаз-рок: сінкопы, акцэнты, нюансы, артыкуляцыя штрыхоў, штрыхавыя асаблівасці. Выкананне твораў у стылі джаз-рок. Вывучэнне выканальніцкай манеры ўдзельнікаў ансамбля – майстроў эстрады. Спецыфіка ігры на электрычных інструментах (электраскрыпка, электравіяланчэль). Асаблівасці гуказдабывання і выканання штрыхоў.

*Тэма 12. Канцэртнае выступленне*

Максімальная мабілізацыя ўвагі, канцэнтрацыя творчых сіл, эмацыянальны настрой як асноўныя ўмовы паспяховасці канцэртнага выступлення. Шматбаковасць мастацкага вобраза. Змест мастацкіх вобразаў у працэсе выканання канцэртнай праграмы. Артыстызм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*Благой, Д.Д.* Искусство камерного ансамбля и музыкально-педагогический процесс [Текст] / Д.Д.Благой. – М.: Музыка, 1979. – 180 с.

*Верхолаз, Р.* Вопросы методики чтения нот с листа [Текст] / Р.Верхолаз. – М.: Музыка, 1969. – 140 с.

*Гайдомович, Т.А.* Заметки об “Элегическом трио” Рахманинова и его исполнителях [Текст] / Т.А.Гайдомович. – М.: Музыка, 1977. – 20 с.

*Гарбузов, Н.А.* Зонная природа звуковысотного слуха [Текст] / Н.А.Гарбузов. – М.: Музгиз, 1948. – 56 с.

*Гинзбург, Л.С.* Камерная музыка в современной музыкальной практике [Текст] / Л.С.Гарбузов. – М.: Музыка, 1979. – 290 с.

*Григорьев, В.Ю.* Самостоятельная работа по специальности: принципы и методы [Текст] / В.Ю.Григорьев. – М.: Музыка, 1979. – 110 с.

*Григорян, А.Г.* Заметки преподавателя в квартетном классе [Текст] / А.Г.Григорян. – М.: Музыка, 1979. – 70 с.

*Давидян, Р.Р.* Из опыта работы в квартетном классе [Текст] / Р.Р.Давидян. – М.: Музыка, 1979. – 320 с.

*Зыбцев, А.Л.* Из опыта работы педагога класса камерного ансамбля [Текст] / А.Л.Зыбцев. – М.: Музыка, 1979. – 112 с.

*Хасанова, В.Н.* Музыкальный ритм [Текст] / В.Н.Хасанова. – М.: Музыка, 1980. – 50 с.

*Дадатковая*

*Гинзбург, Л.С.* К.Ю.Давыдов [Текст] / Л.С.Гинзбург. – Л.: Сов. композитор, 1968. – 280 с.

*Казальс, П.* Автобиография [Текст] / П.Казальс. – М.: Сов. композитор, 1976. – 520 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Козолупова, Г.С.* С.М.Козолупов [Текст] / Г.С.Козолупова. – М.: Музыка, 1974. – 220 с.

*Нейгауз, Г.* Об искусстве фортепьянной игры [Текст] / Г.Нейгауз. – М.: Музыка, 1969. – 180 с.

*Шабриков, В.Д.* Способности, одаренность, талант [Текст] / В.Д.Шабриков. – М.: Музыка, 1991. – 200 с.

*Ширинский, А.* Штриховая техника скрипача [Текст] / А.Ширинский. – Л.: Сов. композитор, 1979. – 110 с.

*Шульпяков, О.Ф.* О психофизическом единстве исполнительского искусства [Текст] / О.Ф.Шульпяков. – Л.: Сов. композитор, 1973. – 300 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

*Балы, паказчыкі ацэнкі*

***1 (адзін)*** – адмова ад выканання праграмы па інструментальным ансамблі, адсутнасць накаплення ведаў і кампетэнтнасці ў рамках адукацыйнага стандарту.

***2 (два)*** – фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; веды асобных музычна-выканальніцкіх крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; няўменне выкарыстаць музычную тэрміналогію, наяўнасць у выкананні грубых і лагічных памылак, адсутнасць сумеснага музіцыравання ў ансамблі; эмацыянальная пасіўнасць, нізкі ўзровень музычна-выканальніцкай культуры.

***3 (тры)*** – недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; выкананне музычных твораў з істотнымі і лагічнымі памылкамі; слабае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; пасіўнасць на занятках, нізкі ўзровень музычнай культуры выканання ў ансамблі.

***4 (чатыры)*** – дастатковы аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; засваенне праграмы па інструментальным ансамблі, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; лагічнае выкананне музычных твораў без істотных памылак; валоданне прынцыпамі ансамблевага выканання; недакладнае інтанаванне, адчуванне ансамблевага рытму, уменне слухаць галасы іншых партый.

***5 (пяць)*** – дастатковы аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; дастатковы ўзровень музычна-выканальніцкай культуры ў ансамблі; разуменне мастацкай задумы аўтара музычнага твора і прыёмаў яе ўвасаблення пры ансамблевым выкананні; недакладнае інтанаванне, рытм, штрыхі.

***6 (шэсць)*** – досыць поўныя сістэматызаваныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ансамблевай ігры; прысутнасць комплексу музыкальных здольнасцей (інтанаванне, адчуванне ансамблевага рытму, уменне слухаць галасы калег па ансамблі); недасканалыя сродкі выразнасці рэалізацыі мастацкай задумы аўтара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***7 (сем)*** – сістэматызаваныя і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ансамблевай ігры; наяўнасць комплексу музыкальных здольнасцей (дакладнае інтанаванне, рытм, штрыхі, уменне слухаць галасы калег па ансамблі); разуменне мастацкай задумы аўтара музычнага твора і прыёмаў яе ўвасаблення пры выкананні ў ансамблі; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; недасканалае валоданне тэхнічнымі сродкамі выразнасці.

***8 (восем)*** – сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў аб’ёме вучэбнай праграмы; наяўнасць комплексу музыкальных здольнасцей (дакладнае інтанаванне, адчуванне ансамблевага рытму, уменне слухаць галасы калег па ансамблі і г. д.); свабоднае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; актыўная самастойная праца і сістэматычны ўдзел у розных канцэртных мерапрыемствах; высокі музычна-мастацкі густ выканання.

***9 (дзевяць)*** – сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ансамблевай ігры; наяўнасць музыкальных здольнасцей (дасканалае інтанаванне, артыкуляцыя штрыхоў, рытмічных узораў, баланс гучання, уменне слухаць галасы калег па ансамблі і г. д.); наяўнасць мабілізацыі ўвагі, канцэнтрацыі творчых сіл, сваіх адносін да выканання, адзінства інтэрпрэтацыі, сумеснае адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ; актыўная самастойная праца і сістэматычны ўдзел у канцэртах.

***10 (дзесяць)*** – сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ансамблевай ігры; бездакорнае выкананне праграмы; адзінства інтэрпрэтацыі музычнага твора, сумеснае адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ, дасканалае інтанаванне, асэнсаваны рытм, баланс гучання, дынаміка, тэмп; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры ў рамках вучэбнай праграмы; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы пры выкананні музычных твораў у ансамблі; улічваць спецыфіку ігры на электраінструментах; удзел у канцэртах, фестывалях, конкурсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі:

– тэматыка адкрытых заняткаў;
– тэставыя заданні;
– тыпавыя заданні;
– тэсты па асобных тэмах;
– кантроль самастойнай працы;
– вуснае апытанне ў час заняткаў;
– калоквіум;
– выступленне студэнтаў у тэматычных канцэртах;
– экзамен;
– дзяржаўны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ**
**(скрыпка, альт, віяланчэль)**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамках спецыяльнасці 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады*
*(інструментальная музыка), 1-17 03 01-02 Мастацтва*
*эстрады (камп’ютарная музыка)*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16.}$
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,88. Ул.-выд. арк. 0,44.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ